# Жж

















ж





ж








жа
жу
жы
жо
жэ



жа́ба



жы́та



во́жык



жэле́



жаўру́к



кажу́х

Жук, жа́ба, жо́раў, жаўру́к, во́жык — гэ́та жывёла.

Хто жыве́ ў ле́се?
Хто жыве́ на бало́це?
Раскажы́ Жэ́ўжыку.



с л м а і ы у ў г п т о э р ч н

жаўру́к жо́раў го́жы
жа́варанак жураве́ль прыго́жы



Як па-і́ншаму называ́ецца жо́раў?
Як па-і́ншаму называ́ецца жа́варанак?

## Жураўлі́

Жураўлі́ — ве́льмі прыго́жыя пту́шкі. Яны́ высо́кія і мо́цныя. Між пту́шак жо́равы — ле́пшыя танцо́ры. Ве́льмі хо́раша гэ́тыя пта́хі танцу́юць ра́ніцай. Спача́тку яны́ кла́няюцца, распуска́юць кры́лы. По́тым злята́юцца ў круг і ска́чуць. Жураўлі́ бы́ццам гуля́юць у вясёлую гульню́.



Назіра́ць за іх та́нцамі ціка́ва. Але́ заўва́жыць гэ́тых пту́шак няпро́ста. Яны́ жыву́ць на бало́тах у глухі́х мясці́нах.

к й я ю е ё з в б ц ь ш х ж



Правообладатель Академия образования

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| жы | жа | жо | жу | жэ |
| шы | ша | шо | шу | шэ |

кашы́ — кош
нажы́ — нож
гаражы́ — гара́ж

карашо́к — карашкі́
ражо́к — ражкі́
кружо́к — кружкі́

## Што лі́шняе? Чаму́?






ры́жык | мухамо́р | смаржо́к | сырае́жка






ру́жа | ажы́ны | журaві́ны | маро́шка

## Хто лі́шні? Чаму́?






чыж | стрыж | смоўж | жаўна́

## Скажы́ іна́кш!



сцю́жа — маро́з
жму́ркі — хо́ванкі

смоўж — слімáк
жаўна́ — …

с л м а і ы у ў г п т о э р ч н



Ла́стаўкі, жа́варанкі, жураўлі́ — пералётныя пту́шкі. Усе́ яны́ во́сенню ляця́ць у вы́рай, а вясно́й вярта́юцца.

Пе́ршымі з вы́раю вярта́юцца жаўрукі́. Іх сустрака́юць пе́сенькай-замо́вай:

Жаваро́начкі, прыляці́це,
Цёпла ле́цейка прыняс́іце!



## Журaві́ны

На бало́це жураўлі́ным
Мы шука́ем
Журaві́ны.

Журaві́ны мы збіра́ем —
Вам, сябры́,
Таксáма ра́ім.

Уладзімір Мазго.



Чаму́ бало́та назва́на жураўлі́ным?
Чым кары́сныя журaві́ны?

к й я ю е ё з в б ц ь ш х ж



Правообладатель Академия образования